9. Постановление Верховного Совета РБ № 3249-XII от 30.09.1994. О Программе неотложных мер по выходу экономики Республики Беларусь из кризиса [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://belzakon.net/Законодательство/Постановление_Верховного_Совета_РБ/1994/94657. – Дата доступа: 30.02.2023.

10. Соглашение о создании Содружества Независимых Государств [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.mid.ru/print/?id=1673617&lang=ru. – Дата доступа: 26.02.2023.

11. Социально-экономическое развитие постсоветских стран: итоги двадцатилетия / Л. Б. Вардомский [и др.]. – М .: ИЭ РАН, 2012. – 400 с.

12. *Шимов, В. Н.* Национальная экономика Беларуси : учебник для студентов учреждений высшего образования по экон. спец. / В. Н. Шимов [и др.] ; под ред. В. Н. Шимова. – 4-е изд., перераб. и доп. – Минск : БГЭУ, 2012. – 649 с.

УДК 94(476)+94(100)"1914/1917"

# ФІНАНСАВАЯ ДАПАМОГА СЕМ’ЯМ ВАЙСКОЎЦАЎ У ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ (1914–1917 гг.)

**Я. А. Бодрыкаў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, yaugen.bodrykau@yandex.by*

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца вызначэнне памераў і форм сацыяльнай дапамогі сем’ям вайскоўцаў у Віцебскай губерні з боку дзяржаўных інстытутаў і грамадскіх арганізацый. У даследаванні звяртаецца ўвага, што дзяржаўнай дапамогі для падтрымання сем’яў мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння было недастаткова, таму дзяржава актыўна заклікала да ўдзелу грамадскія і прыватныя арганізацыі. Дапамога з боку апошніх істотна зменшылася ўжо з лета – восені 1915 г. Сістэма сацыяльнай дапамогі ў Мінскай губерні не была цэнтралізаванай і мела вялікую залежнасць ад настрояў і дабрабыту грамадства, якія за перыяд Першай сусветнай вайны толькі пагоршыліся. Кардынальныя змены ў сістэме сацыяльнай дапамогі сем’ям вайскоўцаў адбыліся толькі пасля падзей Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і ўсталявання Часовага ўрада.

***Ключавыя словы:*** фінансавая дапамога; Закон 25 чэрвеня 1912 г.; папячыцельства; дабрачыннасць.

# ФИНАНСОВАЯ ПОМОЩЬ СЕМЬЯМ ВОЕННОСЛУЖАЩИХ В ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНИИ (1914–1917 гг.)

**Е. А. Бодриков**

*Белорусский государственный университет, пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, yaugen.bodrykau@yandex.by*

Целью данного исследования является определение размеров и форм социальной помощи семьям военнослужащих в Витебской губернии со стороны государственных институтов и общественных организаций. В исследовании обращается внимание, что

государственной помощи для поддержания семей мобилизованных нижних чинов и ратников ополчения было недостаточно, поэтому государство активно призывало к участию общественные и частные организации. Помощь со стороны последних существенно уменьшилась уже с лета–осени 1915 г. Система социальной помощи в Минской губернии не была централизованной и имела большую зависимость от настроений и благополучия общества, которые за период Первой мировой войны только ухудшились. Кардинальные изменения в системе социальной помощи семьям военнослужащих произошли только после событий Февральской революции 1917 г. и установления Временного правительства.

***Ключевые слова:*** финансовая помощь; Закон 25 июня 1912 г.; попечительство; благотворительность.

## FINANCIAL ASSISTANCE TO MILITARY FAMILIES IN VITEBSK PROVINCE (1914–1917)

**Ya. A. Bodrykau**

*Belarusian State University, 4 Nezavisimosti Avenue, Minsk 220030, Belarus, yaugen.bodrykau@yandex.by*

The purpose of this research is to determination the dimensions and forms of social assistance to military families in Vitebsk province from state institutions and public organizations. The research draws attention to the fact that the state assistance at supporting families of mobilized lower ranks and mili-tia warriors was insufficient, so the state actively called for the participation of public and private organizations. Assistance from the latter has been significantly reduced since the summer–autumn of 1915. The system of social assistance in the Minsk province was not centralized and was highly depend-ent on the mood and well–being of society, which only worsened during the First World War. Fundamental changes in the system of social assistance to military families occurred only after the events of the February Revolution of 1917 and the establishment of the Provisional Government.

***Keywords:*** financial assistance; the Law of June 25, 1912; guardianship; well–being.

Першая сусветнай вайна стала адкрыла эпоху «татальных канфліктаў», якія патрабавалі ад дзяржаў-удзельніц максімальнага напружання і выкарыстання не толькі ўласных узброеных сіл, але таксама эканомікі і грамадства, якія павінны былі працаваць на ваенныя патрэбы ўласнай дзяржавы. Адным з галоўных наступстваў Першай сусветнай вайны для шырокіх колаў грамадства стала масавая мабілізацыя мужчынскага насельніцтва ва ўзброеныя сілы Расійскай імперыі. Дадзены працэс прыводзіў да негатыўных эканамічных наступстваў для сем’яў мабілізаваных. У першую чаргу гэта тычылася небагатых шматдзетных сем’яў і сем’яў сялян, якія такім чынам гублялі працаздольнага мужчыну, які нярэдка быў адзіным паратункам яе членам.

Азначаныя вышэй фактары прывялі да з’яўлення як дзяржаўнай (казённай) дапамогі азначаным сем’ям, так і прыватных ініцыятыў у дадзеным кірунку. Галоўным заканадаўчым актам Расійскай імперыі, згодна якому

ажыццяўлялася ўся дабрачынная дзейнасць у сферы аказання сацыяльнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў, стала прынятае 25 чэрвеня (8 ліпеня) 1912 г. «Палажэнне аб апекаванні ніжніх чыноў і іх сем'яў», больш вядомае ў грамадстве як «Закон 25 чэрвеня 1912 г.». Назва дакумента падкрэслівала, што дзяржаўная дапамога павінна аказвацца толькі сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў (салдат і ўнтэр-афіцэраў) і ратнікаў апалчэння. Сем'і афіцэраў павінны былі ўтрымлівацца за частку афіцэрскага жалавання, а ўдовы і сіраты (да 17-гадовага ўзросту) афіцэраў (як і ніжніх чыноў) атрымлівалі права на дзяржаўную пенсію [2, с. 30].

Згодна азначанаму вышэй дакументу, дапамога выдавалася членам сямей ніжніх чыноў, якіх прызвалі ў войска пры мабілізацыі (у тым ліку і тым, хто добраахвотна пайшоў у войска пры мабілізацыі); затрыманых у войску больш тэрміну абавязковай службы з-за мабілізацыі; ратнікаў дзяржаўнага апалчэння, адпраўленых на вайсковую службу і тых, хто паступаў на службу ў ваенныя дружыны. На безумоўную дапамогу маглі разлічваць толькі афіцыйныя жонкі і «законныя» дзеці (да 17-гадовага ўзросту) мабілізаваных ніжніх чыноў. Акрамя таго, разлічваць на дапамогу маглі бацькі, браты і сёстры, дзяды і бабкі мабілізаванага, калі яны «ўтрымліваліся працай апошняга». Таксама аказвалася дапамога жонкам старавераў і сектантаў, нават калі яны не жылі ў зарэгістраваным шлюбе, а таксама іх дзецям. Дзяржаўная дапамога выдавалася ў грашовым эквіваленце кошту харчовага пайка ў памеры 1 пуда 28 фунтаў мукі (каля 29 кг.), 10 фунтаў крупы (4,5 кг.), 4 фунтаў солі (1,8 кг.) і 1 фунта поснага алею (0,45 л.) на месяц на чалавека. Дзецям да 5 гадоў такая дапамога выдавалася ў палавінным памеры [1, с. 431].

Пазашлюбныя дзеці і жонкі, а таксама пасынкі, падчарыцы і прыёмныя дзеці не мелі права да дзяржаўныя выплаты, але маглі разлічваць на дапамогу з грамадскіх і дабрачынных сродкаў. Гэтае ж правіла фактычна распаўсюджвалася і на сем'і афіцэраў, якія мелі фінансавыя праблемы і знаходзіліся ў складаным матэрыяльным становішчы. У 1915 г. выйшла новае Палажэнне, згодна якому сем'і дэзерціраў і вайскоўцаў, якія добраахвотна здаліся ў палон, пазбаўляліся дзяржаўнай дапамогі. Акрамя таго, харчовы паёк не выдаваўся сем'ям ніжніх чыноў, якія яшчэ да вайны былі прызваныя на тэрміновую службу і працягвалі адбываць яе.

Не гледзячы на існаванне агульнага заканадаўства, многія губерні мелі ўласныя асаблівасці аказання сацыяльнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў. Не стала выключэннем і Віцебская губерня. У беларускай гістарыяграфіі пытанне аказання фінансавай дапамогі сем'ям вайскоўцаў у Віцебскай губерні разглядалася толькі ў кантэксце гэтага ж працэсу на тэрыторыі ўсіх беларускіх губерняў даследчыцай Н. С. Маторавай [3]. Апека сем'яў мабілізаваных больш падрабязна даследавана ў работах расійскіх гісторыкаў апошніх

дзесяцігоддзяў. Сярод прац, у якіх вылучалася Віцебская губерня, варта адзначыць дысертацыйнае даследаванне А. Дз. Грудзіны [2] і артыкул С. У. Букалавай [1].

Стварэнне сеткі дзяржаўных устаноў і грамадскіх арганізацый у сферы сацыяльнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў пачалося ў ліпені – жніўні 1914 г., пасля абвяшчэння ўсеагульнай мабілізацыі. Дзейнасць дзяржаўных устаноў па грашовым выплатам для сем'яў мабілізаваны ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння прадугледжвалася Законам ад 25 чэрвеня 1912 г. Для апекавання над сем'ямі мабілізаваных у сельскай мясцовасці абіраліся валасныя папячыцельства, а ў выпадку іх адсутнасці гэтыя функцыі ўскладваліся на валаснога старшыню. Згодна заканадаўству, валасны сход павінен быў абраць не менш 3-х чалавек у склад валаснога папячыцельства [1, с. 437].

Асноўнай задачай валаснога папячыцельства было абследаванне складу і ўмоў жыцця сем'яў мабілізаваных. Кантроль за дзейнасцю валасных папячыцельстваў належаў земскім участковым начальнікам. Валасныя папячыцельства павінны былі даследаваць сем'і і гаспадаркі ў 2-тыднёвы тэрмін са дня абвяшчэння мабілізацыі. Непасрэднае рашэнне аб усталяванні канкрэтнай сумы выплат кожнай сям'і на падставе інфармацыі, сабранай на валасным узроўні, прымаў павятовы з'езд, пасля чаго дадзеныя перадаваліся ў губернскую прысутнасць. Аднак, ужо 29 жніўня (11 верасня) 1914 г. выйшаў указ, згодна якому функцыі павятовых з'ездаў у справе выдачы дзяржаўнай дапамогі пераходзілі да адпаведных павятовых папячыцельстваў ці павятовых земскіх управаў. Непасрэдна сем'ям мабілізаваных у сельскай мясцовасці грошы выдаваліся 4 разы ў год: у сакавіку, чэрвені, верасні і снежні праз валаснога старшыню [2, с. 192].

Сістэма дзяржаўнай дапамогі ў гарадской мясцовасці мела свае адрозненні. У гарадах Расійскай імперыі функцыі па збору інфармацыі аб становішчы сем'яў мабілізаваных ускладваліся на гарадскія ўправы ці гарадскіх стараст, аднак па рашэнні мясцовых уладаў маглі быць створаны і адпаведныя камісіі ці асобныя папячыцельства. Як і ў сельскай мясцовасці, гэтыя органы павінны былі збіраць інфармацыю аб колькасным і гаспадарчым станах сем'яў мабілізаваных і цягам вайны сачыць за зменамі па гэтых параметрах. У гарадах, у адрозненні ад сельскай мясцовасці, грашовыя выплаты адбываліся кожны месяц. Нагляд за дзейнасцю ўсіх дзяржаўных органаў па дапамозе сем'ям мабілізаваных у межах кожнай губерні належаў мясцоваму губернатару. На тэрыторыі Віцебскай губерні першыя гарадскія папячыцельства былі створаны ў Полацку і Лепелі ўжо ў жніўні 1914 г. [7, арк. 171], а ў наступныя месяцы ў іншых гарадах губерні [6, арк. 479].

Сярод гісторыкаў няма адзінай думкі наконт агульнай колькасці мабілізаваных на тэрыторыі беларускіх губерня падчас Першай сусветнай вайны, што ўскладняе і асобныя падлікі па Віцебскай губерні. Аднак, у

верасні 1917 г. Міністэрствам унутраных спраў была падлічаная колькасць асоб па губернях, якія атрымлівалі дзяржаўную дапамогу па прычыне мабілізацыі блізкага сваяка. У Віцебскай губерні на той момант выдавалася ўсяго 439 278 пайкоў (на чалавека), з якіх 402 471 у сельскай мясцовасці і толькі 36 807 у гарадах губерні. Трэба заўважыць, што такая колькасць фарміравалася паступова, бо да пачатку сакавіка 1917 г. на тэрыторыі Віцебскай губерні было праведзена 22 хвалі мабілізацыі [3, с. 268]. Акрамя таго, паступова змяняўся і кошт пайка, які быў прывязаны да мясцовых цэн на харчаванне. Так, у верасні 1917 г. адзін паёк у гарадской мясцовасці абыходзіўся ўладам у 19 руб. 15 кап., у той момант як у сельскай мясцовасці ацэньваўся ў 15 руб. 71 кап. Такім чынам, кошт пайка ў Віцебскай губерні быў на некалькі рублёў вышэйшы, чым сярэдні па астатнім неакупаваным беларускім губерням [1, с. 486].

Важная роля ў аказанні сацыяльнай дапамогі сем'ям мабілізаваных адводзілася мясцовым земствам і органам самакіравання, якія аказвалі дапамогу і сем'ям, якія не атрымлівалі дзяржаўнай дапамогі, і сем'ям, якія атрымлівалі яе ў малым або недастатковым памеры. Так, напрыклад, Віцебская гарадская дума да канца 1914 г. вылучыла на гэтыя патрэбы 11,5 тыс. руб. [4, арк. 467]. Аднак, з павелічэннем колькасці сем'яў мабілізаваных і бежанцаў, а таксама павышэннем кошту прадуктаў магчымасці аказання дадатковай дапамогі з боку земскіх устаноў і дум толькі змяншаліся.

Важную ролю ў арганізацыі дадатковай фінансавай дапамогі сем'ям вайскоўцаў адыгрывалі дабрачынныя арганізацыі, сярод якіх асабліва вылучаўся «Камітэт вялікай княгіні Елізаветы Фёдараўны па аказанні дабрачыннай дапамогі сем'ям асобаў, прызваных на вайну» (шырока вядомы як Елізавецінскі камітэт). Дадзеная арганізацыя знаходзілася пад кіраўніцтвам вялікай княгіні Елізаветы Фёдараўны (роднай сястры імператрыцы), што надавала Камітэту як дадатковае фінансаванне з боку дзяржавы, так і спрыяла стварэнню асаблівых умоў дзейнасці арганізацыі з боку мясцовых уладаў. Віцебскае губернскае аддзяленне арганізацыі ўзначальваў непасрэдна віцебскі губернатар. Віцебскае губернскае аддзяленне Елізавецінскага камітэта ў сваю чаргу падзялялася на гарадскія і павятовыя камісіі, якія таксама маглі падзяляцца на мясцовыя камісіі. У сваёй дзейнасці на тэрыторыі Віцебскай губерні Елізавецінскі камітэт паступова ўключаў у сетку сваіх устаноў і больш дробныя дабрачынныя ўстановы, што рабіла арганізацыю манапалістам у сферы недзяржаўнай дапамогі сем'ям вайскоўцаў [9, арк. 41–42].

Варта адзначыць, што земскія ўстановы, органы гарадскога самакіравання і дабрачынныя арганізацыі выдавалі фінансавыя сродкі на канкрэтныя запыты і праблемы. У першую чаргу гэта тычылася тых расходаў, якія не ўлічваліся пры выплаце дзяржаўнай дапамогі, напрыклад адукацыя дзяцей, ацяпленне і арэнда памяшкання, медыцынскія паслугі [9, арк. 5]. Гэтыя праблемы былі больш актуальны менавіта для гарадскога насельніцтва губерні. Акрамя таго, дапамога магла аказвацца і ў выпадку страты

часткі або ўсёй маёмасці, напрыклад у выніку яе крадзяжу. Аднак, магчымасць і памер дапамогі ў дадзеным выпадку залежаў ад матэрыяльнага стану пацярпелых сваякоў вайскоўцаў [10, арк. 104].

Улічваючы тое, што Елізавецінскі камітэт узяў на сябе апеку пазашлюбных дзяцей мабілізаваных ніжніх чыноў, на аказанне падтрымкі іншых сем'яў далёка не заўсёды знаходзілася фінансаванне. Грашовая дапамога сем'ям вайскоўцаў у большасці выпадкаў насіла разавы характар, аднак паступова колькасць адмоўных адказаў на звароты і запыты з боку камітэта толькі ўзрастала [9, арк. 3]. Прычына была ў тым, што з 1915 г. колькасць ахвяраванняў на дабрачыннасць істотна знізілася, а дзяржаўных субсідый было недастаткова для маштабнай дзейнасці арганізацыі. Такая ж тэндэнцыя назіралася сярод земскіх устаноў, органаў самакіравання і іншых дабрачынных арганізацый. Напрыклад, у Невелі памер дадатковай дапамогі вагаўся ад 30 да 65 кап. на чалавека ў месяц [5, арк. 125 адв.], а ў Полацку ад 1 руб. да 2 руб. Пры гэтым, ужо ў пачатку 1915 г. выплата дадатковай грашовай дапамогі ў Полацку была цалкам спыненая па прычыне адсутнасці ў горада сродкаў [8, арк. 54].

Варта адзначыць, што недахоп фінансавых сродкаў мог прыводзіць да выдачы харчовых пайкоў і дадатковай дапамогі ў форме сапраўднага харчовага пайка. У 1916 г. такая практыка была ўведзена ў Невелі і ў Себежскім павеце Віцебскай губерні [3, с. 271]. Аднак, у большасці паветаў і гарадоў Віцебскай губерні выдача фінансавай дапамогі адбывалася згодна заканадаўству ў грашовым эквіваленце.

Нярэдка ў Елізавецінскі камітэт звярталіся і ўдовы або дзеці афіцэраў, якім для ўласнага забеспячэння ці працягу адукацыі не хапала дзяржаўнай пенсіі. У большасці выпадкаў камітэт аказваў разавую дапамогу такім сем'ям, аднак сумы дапамогі адрозніваліся ад той, якую маглі атрымаць сваякі ніжніх чыноў. Так, напрыклад, бяздзетная ўдава падпрапаршчыка магла разлічваць на дапамогу ад арганізацыі ў памеры 25 руб. [11, арк. 119], а ўдава падпрапаршчыка з 2-мя дзецьмі на 40 руб. [11, арк. 199]. На памер выплат уплывала не толькі колькасць дзяцей і эканамічны стан сям'і, але і чын загінулага вайскоўца. Так, удава падпалкоўніка М. А. Знаменская, маючы на ўтрыманні 2-х дзяцей-вучняў, двойчы атрымала ад Елізавецінскага камітэта па 100 руб. разавай фінансавай дапамогі [11, арк. 218–219]. Пры гэтым, зацверджаны памер дзяржаўнай пенсіі для ўдоў вайскоўцаў вагаўся ад 48 руб. да 84 руб. у залежнасці ад чыну і тэрміну службы вайскоўца.

Асаблівасцю Віцебскай губерні была наяўнасць значнай колькасці нацыянальных яўрэйскіх, польскіх і латышскіх дабрачынных арганізацый, якія аказвалі дапамогу сем'ям мабілізаваных яўрэяў, палякаў і латышоў. Аднак, іх грашовая дапамога ў дадзеным выпадку таксама аказвалася ў невялікіх памерах. Акрамя таго, на тэрыторыі губерні дзейнічалі прыхадскія папячыцельства, якія ўзначальвалі мясцовыя праваслаўныя святары. Больш прадуктыўнай была праца прыходскіх папячыцельстваў у сельскай мясцовасці, бо ў вёсках царква часцей адыгрывала значную ролю ў сацыяльнай і

духоўнай сферах. Нярэдка святары асабіста ведалі многія сем'і ніжніх чыноў, з-за чаго карысталіся большым даверам з боку апошніх. Аднак, дзейнасць многіх прыходскіх папячыцельстваў не мела працяглай актыўнасці або ўвогуле адбывалася выключна фармальна, што не дазваляе прасачыць рэальную колькасць актыўных прыходскіх папячыцельстваў у межах Віцебскай губерні. Напрыклад, у Себежскім павеце ў жніўні 1915 г. такія папячыцельства апекавалі 171 сям'ю вайскоўцаў, дапамагаючы не толькі фінансаваннем, але і збожжам [9, арк. 27–28].

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. унеслі істотныя змены ў функцыянаванне сістэмы сацыяльнай падтрымкі сем'яў вайскоўцаў. Ужо пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. па прычыне свайго «манархічнага характару» цалкам спыніў сваё існаванне Елізавецінскі камітэт, што пазбавіла магчымасці атрымаць дадатковае фінансаванне шматлікія сем'і вайскоўцаў на тэрыторыі губерні. Акрамя таго, істотна скарацілася дзяржаўная падтрымка прыватных і нацыянальных дабрачынных арганізацый, што таксама ўплывала на эканамічны стан сваякоў вайскоўцаў. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. прывяла да поўнай перабудову сістэмы матэрыяльна-фінансавага забеспячэння не толькі сем'яў мабілізаваных вайскоўцаў, але і ўсяго грамадства.

Падсумоўваючы, трэба адзначыць, што сістэма фінансавай дапамогі сем'ям вайскоўцаў у Расійскай імперыі ў перыяд Першай сусветнай вайны грунтавалася на спалучэнні дзяржаўнай і грамадскай дапамогі. Законам ад 25 чэрвеня 1912 г. толькі сем'ям мабілізаваных ніжніх чыноў і ратнікаў апалчэння дзяржава кампенсавала адсутнасць гаспадароў харчовай дапамогай у грашовым эквіваленце. Пры гэтым, такую дапамогу маглі атрымаць толькі «законныя» жонка і дзеці (узростам да 17 год) мабілізаванага. Земскія ўстановы, органы самакіравання, дабрачынныя арганізацыі і прыходскія папячыцельства на тэрыторыі Віцебскай губерні аказвалі дапамогу як тым сем'ям вайскоўцаў, якія не атрымлівалі дзяржаўны паёк, так і тым, хто атрымліваў у недастатковым памеры. Аднак, з-за абмежаванасці сродкаў недзяржаўная фінансавая дапамога насіла абмежаваны па памеры і пераважна разавы характар. Асаблівасцю Віцебскай губерні з'яўлялася значная колькасць нацыянальных дабрачынных арганізацый, якія аказвалі дапамогу сем'ям мабілізаваных палякаў, яўрэяў і латышоў. Сістэма фінансавай дапамогі сем'ям вайскоўцаў істотна змянілася пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і фактычна была скасавана ўжо пасля прыходу да ўлады бальшавікоў.

## Бібліяграфічны спіс

1. *Булгакова, Л. А.* Привилегированные бедняки: помощь солдатским семьям в годы Первой мировой войны / Л. А. Булгакова // На пути к революционным потрясениям. Из истории России второй половины XIX – начала XX века. Материалы конференции памяти В. С. Дякина. – СПб.; Кишинев: Nestor–Historia, 2001. – С. 429–493.

2. *Грудина, А. Д.* Государственная помощь семьям нижних чинов российской армии в годы Первой мировой войны: диссертация на соискание учёной степени кандидата исторических наук: специальность 07.00.02 Отечественная история / Алексей Дмитриевич Грудина. – Брянск, 2019. – 242 с.
3. *Моторова, Н. С.* Помощь семьям мобилизованных на территории Беларуси в 1914–1916 гг. / Н. С. Моторова // Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. статей. – Минск : РИВШ, 2023. – (Научные труды Республиканского института высшей школы; Вып. 23, ч. 1 : Исторические науки) – С. 266–274.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 5768.
5. НГАБ. – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 5772.
6. НГАБ. – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 5776.
7. НГАБ. – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 5779.
8. НГАБ. – Ф. 2508. Воп. 1. Спр. 6090.
9. НГАБ. – Ф. 2665. Воп. 1 Спр. 5.
10. НГАБ. – Ф. 2665. Воп. 1. Спр. 9.
11. НГАБ. – Ф. 2665. Воп. 1. Спр. 17.

УДК 94(476)"1953/1968"

# АНТЫАЛКАГОЛЬНАЯ КАМПАНІЯ Ў БССР КАНЦА 1950-х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1960-х гг.

**А. А. Гужалоўскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, huzhalouski@bsu.by*

У артыкуле аналізуецца рэалізацыя кампаніі па барацьбе з п'янствам і алкагалізмам у БССР у канцы 1950-х – першай палове 1960-х гг. Паказана, што праблема спажывання спіртных напояў у тыя гады была вельмі актуальнай. Разглядаюцца заканадаўчыя ініцыятывы і практычныя дзеянні ўлады па абмежаванні дзяржаўнага абароту алкаголю і самагонаварэння. Адзначаецца, што алкагалізм уяўляў сур'ёзную сацыяльную праблему для беларускага грамадства, наносіў шкоду здароўю насельніцтва. Дзяржаўная палітыка і дзеянні беларускага кіраўніцтва па барацьбе з ім не мелі значных станоўчых вынікаў. У цэлым антыалкагольная палітыка была супярэчлівай і мела неадназначныя наступствы.

***Ключавыя словы:*** БССР; адліга; дзяржаўная палітыка; антыалкагольная кампанія; п’янства; самагонаварэнне.

# АНТИАЛКОГОЛЬНАЯ КАМПАНИЯ В БССР КОНЦА 1950-х – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЫ 1960-х гг.

**А. А. Гужаловский**

*Белорусский государствнный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, huzhalouski@bsu.by*

В статье анализируется реализация кампании по борьбе с пьянством и алкоголизмом в БССР в конце 1950-х – первой половине 1960-х гг. Показано, что проблема потребления спиртных напитков в те годы являлась весьма актуальной. Рассматриваются